УДК 240.1 (476)

*М.Ю.ГАРДЗЕЕЎ*

# НОВЫ ДАКУМЕНТ ДА БІЯГРАФІІ СІМЯОНА ПОЛАЦКАГА

Больш за стагоддзе вывучаюць навукоўцы розных напрамкаў спадчыну і жыццё знакамітага беларуса, ураджэнца Полацка, – Самуіла Гаўрылавіча Пятроўскага-Сітняновіча (Сімяона Полацкага). Сваёй шматграннай дзейнасцю – асветнік і філосаф, першы прафесійны расійскі пісьменнік і паэт, кнігавыдавец і перакладчык, стваральнік першага расійскага тэатру і астролаг, выхавальнік і настаўнік дзяцей цара Аляксея Міхайлавіча, аўтар праекта па стварэнню першай у Расіі вышэйшай навучальнай установы (будучай Славяна-грэка-лацінскай акадэміі) – ён забяспечыў сабе трывалае месца адной з найбуйнейшых постацей усходнеславянскай культуры XVII ст.

Аднак, нягледзячы на вялікае значэнне Сімяона Полацкага для культур не толькі ўсходніх славян, але і, увогуле, рэгіёна Усходняй Еўропы, у карціне яго дзейнасці і прыватнага жыцця застаюцца «белыя плямы», праблемныя пытанні, вырашыць якія на падставе вядомых дадзеных не прадстаўляецца магчымым. Сімяон не пакінуў нам нічога падобнага да ўласнаручных запісак, і таму адзінымі крыніцамі, адкуль можна ўзяць звесткі аб яго жыцці, з'яўляюцца сведчанні яго сучаснікаў і асобныя ўрыўкі, што сустракаюцца месцамі ў рукапісах самага асветніка. Гэты факт падкрэсліваюць усе даследчыкі яго жыцця, пачынаючы з І.Татарскага [1]. Толькі ў пачатку XX ст. было адкрыта

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

грамадзянскае імя Сімяона – Самуіл [2]. Доўгі час працягваліся спрэчкі вакол імя па бацьку асветніка, пакуль у 1987 г. маскоўскія даследчыкі М. А. Рабінсон і Л.І.Сазонава не абгрунтавалі версію «Гаўрылавіч» шляхам карпатлівага аналізу ўрыўкавых дадзеных і сярэднявечнай тэрміналогіі кроўнароднасных сувязей [3].

Дадзены артыкул з'яўляецца спробай аўтара вырашыць некаторыя з пытанняў, што тычацца біяграфіі Сімяона Полацкага (у прыватнасці, яго прозвішча, імя па бацьку, а таксама складу сям'і), апіраючыся на акт, знойдзены ў працэсе напісання кандыдацкай дысертацыі «Полацкія магістрацкія кнігі другой паловы XVII ст. як пісьмовая гістарычная крыніца». На нашу думку, ён мае непасрэднае дачыненне да сям'і Сімяона Полацкага, з'яўляючыся тэстаментам яго маці.

Дакумент знаходзіцца ў актавай кнізе полацкага магістрату за 1656 – 1657 гг., датуецца 8 ліпеня 1657 г. (па старому стылю) і тытулаваны: «Тестамент Т*ат*яны Яко*в*левны Шереметовое, ра*ц*овое поло*ц*кое» [4]. На карысць нашага меркавання можна прывесці супастаўленні наступных фактаў.

Ранейшыя даследаванні паказваюць, што Самуіл прыняў пострыг у полацкім Багаяўленскім манастыры «въ лето отъ воплощения Бога Слова, 1656 въ неделю вторую по сошествии Св. Духа» [5], г. зн. 8 чэрвеня 1656 г. Такім чынам, запіс тэстаменту ў магістрацкую кнігу («актыкацыя») прыпадае на час яго пражывання ў Полацку пасля вяртання з Вільны. Па-другое, у акце названыя ўсе як вядомыя, так і мяркуемыя члены сям'і асветніка: абодва мужа Т. Я Шарамет (Габрыэль (Гаўрыіл) Сітняновіч-Пятроўскі і Емяльян Шарамет), а таксама браты і сам Сімяон Сітняновіч-Пятроўскі – «велебны*и* о*т*ец, в законе в мона*с*тыру Богоявле*н*ском поло*ц*ко*м* будучы*и*» [6].

Дапускаючы аўтэнтычнасць дакумента, тым не менш, трэба прызнаць, што ён не зусім адпавядае вядомым звесткам аб родных Сімяона Полацкага. Самая істотная супярэчнасць у тым, што, па дадзеных І.Татарскага, маці Сімяона была адзінай жывой з яго бацькоў падчас яго пераезду ў Маскву ў 1663 г.; прыехала яна туды, як паведамляе аўтар, «по-видимому», разам з ім і знаходзілася на яго ўтрыманні [7]. Але, маючы наяўны тэкст юрыдычна заверанага завяшчання, на карысць меркавання аб смерці маці Сімяона іменна ў той час магчыма прывесці наступныя аргументы.

Па-першае, Т. Я. Шарамет памірала, відавочна, ад цяжкай хваробы: як паведамілі «паны *лавники*», яе «знашли... на теле сме*р*те*л*не хорую» [8]. Іншыя ўпісаныя ў кнігу тэстаменты згадваюць аб «облож*но*и хоробе», ад якой пакутавалі паміраючыя [9]. Вядома, што падчас вайны Расійскай дзяржавы з Рэччу Паспалітай 1654 – 1667 гг. на Беларусі панавала эпідэмія, пік якой прыпадае на 1656 – 1658 гг. [10]. Калі прыняць да ўвагі ўзровень развіцця тагачаснай медыцыны, то можна быць упэўненымі, што хворы не меў амаль ніякіх шансаў выжыць. Па-другое, дакумент напісаны не адным почыркам: у двух месцах ён мае надрадковыя ўстаўкі (часціцу «не» і вызначэнне грашовай сумы словамі [11]), г. зн. ён яўна дапрацаваны, прычым, не выключана, самім Лукашом Сітняновічам-Пятроўскім, які, несумненна, меў доступ да магістрацкіх кніг (ён названы ў акце як «по*д*писо*к* на се*с* час поло*ц*ки*и*»; таксама, згодна змесу тэстамента, ён захоўваў у сябе ўсе дакументы па маёмасных і фінансавых справах сям'і [12]). Акрамя таго, напрыканцы тэкста прысутнічае запіс, зроблены тым жа почыркам, што і ўстаўкі, які паведамляе аб выдачы выпісу [13]. Можна з дастатковай пэўнасцю спадзявацца на тое, што актыкацыя і дапрацоўка тэкста тэстамента, роўна як і выдача копіяў адпаведных дакументаў зацікаўленым асобам, не адбыліся б напярод факта смерці асобы, што пакідала тэстамент. Па-трэцяе, калі б маці Сімяона

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

памерла ўжо ў Маскве, гэта, трэба лічыць, знайшло б нейкае адлюстраванне ў яго рукапісах або іншых дакументах. Па-чацвёртае, наўрад ці яна пакінула б малалетняга сына Яна Шарамета, згаданага ў тэстаменце, у Полацку падчас працягвання баявых дзеянняў (нават і «в опеку», як паведамляе акт, Лукашу Сітняновічу-Пятроўскаму [14]). Па-пятае, у сваёй чалабітнай цару ад 1 верасня 1670 г. Сімяон згадвае трох чалавек (не называючы іх імёны), што пражывалі з ім у той час у Маскве [15]. Двое з іх вядомы: жонка яго памерлага (ці загінуўшага) брата Сільвестра (аб ім будзе сказана ніжэй) Ірына Афанасьеўна з сынам Міхаілам [16]. Трэцім быў, верагодна, яго прыехаўшы «в прошлом во 177 (г. зн. у 1669-м, – М. Г.) году... на... Великого Государя имя из Литовския земли брат мой (Сімяона, – М. Г.) единоутробный Иоанн Емельянов сын...» [17]. Больш ніхто з родных Сімяона ў вышэйзгаданых дакументах не названы, што дае нам падставу, з улікам папярэдняга аналізу, лічыць версію І. Татарскага (гл. спасылку 7) недастаткова абгрунтаванай.

Адкрыты акт дазваляе вырашыць шэраг пытанняў, звязаных з братамі Сімяона Полацкага. У навуковым ужытку здаўна знаходзяцца дакументы, дзе яны згаданыя: гэта завяшчанне Сімяона, апублікаванае яшчэ І. Татарскім, а таксама архіўныя даследаванні С. Голубева. У сваім завяшчанні Полацкі піша: «Брату моему родному Иоанну Петровскому, иже обитает в Ковне червонных золотых сто. Брату же моему родному Луке Петровскому, писарю града Полоцка, червонных золотых сто» [18]. Вядомы ліст Сімяона швагеру Васілю Уладзіміравічу Стефановічу, пісару «градскому» мінскаму, у якім ён згадвае брата Яна Пятроўскага [19]. Існуе таксама ліст Сімяона Лукашу, які датуецца 8 кастрычніка 1667 г., дзе асветнік абвінавачвае брата ў адступніцтве ад праваслаўя: «Давно я знал твою склонность к этой измене, но не предполагал такого упрямства с упорством и не думал, что будешь жестоким. В чем, если не услышу исправления, знай, что последний раз читаешь от меня: Vale» [20].

Мы лічым, што Іаан Пятроўскі, які жыў у Коўне, і Ян, аб якім гаворыцца ў лісце швагеру, – тая ж самая асоба, малодшы брат Сімяона Полацкага Ян Сітняновіч-Пятроўскі, што названы ў тэстаменце Т. Я. Шарамет сярод яе сыноў ад першага мужа; апроч таго, ён названы сынам «болшым» сярод «свецкіх» сыноў; хутчэй за ўсё ён займаўся гандлем, таму што ў акце вызначаная грашовая сума, яму «на гандел даная» [21]. Лукаш Сітняновіч-Пятроўскі быў, верагодна, маладзейшы за Яна, калі меркаваць па паслядоўнасці, з якой абодва браты называюцца ў дакуменце: «... двум с першым малжонком спложеным – Яну і Лукашу Ситняновичом-Петровским...» [22]. Лукаш, «подписок на сес час полоцкии» (гл. спасылку 12) да 14 сакавіка 1679 г. (часу складання Сімяонам завяшчання [23]), хутчэй за ўсё заставаўся на пісарскіх пасадах у полацкім магістраце (гл. вышэй тэкст завяшчання Сімяона). Ён згаданы ў адным з актаў магістрацкай кнігі як «прыятел» мешчаніна Мацвея Верамеенкі ў маёмаснай справе [24].

Яшчэ з завяшчання Сімяона Полацкага было вядома, што ў яго быў брат Сільвестр, сына якога – Міхаіла – Сімяон назваў сярод нашчадкаў: «Племяннику моему Михаилу Сильвестровичу, при мне жившему рублев сто, ему же лошадь со всем, медь и цына вся, и килимы два, и сребро, что ся останет» [25]. Вядомы таксама дакумент аб незаконным арышце 14 красавіка 1659 г. паводле ўказу полацкага епіскапа Каліста групы манахаў Багаяўленскага манастыра, у складзе якой быў Сімяон і нейкі Sylvestro Sitnianowicz [26]. Акрамя таго, увагу даследчыкаў звяртаў на сябе асобнік «Зерцала исторического» Вінцэнція Бургундскага (Duaci, 1624) з бібліятэкі Сімяона Полацкага, які належыў раней прапаведніку полацкага Багаяўленскага манастыра Сільвестру Сітняновічу, аб чым сведчыць уладальніцкі надпіс:

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

«Ex libris Sylvestri Sitnianowicz prohinc Concionatori S. Polocensis ad aedes Epiphaniorum». У 1664 г. кніга перайшла да Ігнація Іяўлевіча (ён быў у свой час ігуменам таго ж самага манастыра) і, нарэшце, трапіла да Сімяона Полацкага: «Transiet in Bibliothecam Simeonis Piotrowski Sitnianowicz indigni hieromonachi Polocensis Ord: S: Bas: Mag: Moscowie, Dn: 1670 Aug. 26». У сувязі з гэтым была выказана думка, што Сільвестр прыходзіўся родзічам Сімяону па лініі бацькі, напрыклад, дзядзькам («стрыем») [27]. Англійскі даследчык А. Хіпіслі асцярожна меркаваў, што гэта брат Сімяона [28], і, як паказвае наш акт, не памыліўся. Сільвестр названы разам з Сімяонам як адзін з старэйшых сыноў, «велебныи отец, в законе в монастыру Богоявленском полоцком будучыи Сылвестр Ситнянович-Петровскии» [29]. Названы ён перад Сімяонам, таму магчыма зрабіць выснову аб тым, што Полацкі быў маладзейшым (такім чынам, пацвярджаецца адна з версій М.А.Рабінсона і Л.І.Сазонавай [30]). Бянтэжыць, безумоўна, поўнае супадзенне свецкага і манаскага імёнаў. Можна меркаваць, што Сільвестр трапіў у манастыр ужо падчас вайны 1654 – 1667 гг., спрабуючы такім чынам пазбегнуць удзелу ў гэтых падзеях.

У літаратуры, якая тычыцца родных Сімяона Полацкага, не было звернута ўвагі на згадку ім самім у лісце да швагера (гл. вышэй) яшчэ аднаго брата – Яна Шарамета: «И в настоящее время, когда пишу это письмо, снаряжаю брата своего Яна Петровского, и только три недели тому назад, как уехал от меня *брат Ян Шеремет*» [31] (выдзелена мной, – М. Г.). Трэба лічыць, што даследчыкі з дастаткова малой верагоднасцю дапускалі магчымасць наяўнасці двух аднолькавых імёнаў у двух існуючых братоў, тым больш, што адносна Яна Пятроўскага было дабаўлена істотнае вызначэнне – "своего". Фармуліроўка «брат» адносна Яна Шарамета ў лісце манаха таксама не падштурхоўвала да здагадак аб яго магчымай кроўнай роднасці Сімяону. Адкрыццё тэстамента маці асветніка дазваляе з поўнай упэўненасцю лічыць яго родным малодшым братам Сімяона Полацкага. У тэстаменце Т.Я.Шарамет гэтая асоба называецца вельмі часта ў сувязі з падзелам маёмасці паміж сынамі і прыёмнымі дзецьмі («пасербами»), што засталіся ў другога мужа пасля яго першага шлюбу [32]. Мы мяркуем, што менавіта Ян Шарамет прыехаў у Маскву да Сімяона ў 1669 г. (гл. спасылку 17) і жыў з ім у адной келлі ў Заіканаспасаўскім манастыры [33]. Узнікае, праўда, пытанне: чаму Сімяон не згадаў «брата единоутробного, Иоанна Емельянова сына» у сваім завяшчанні?

Такім чынам, праведзены аналіз папярэдніх дадзеных і зместу тэстамента дае магчымасць назваць наступных сыноў Т. Я. Шарамет (па старшынству): Сільвестр, Самуіл (Сімяон), Ян, Лука(ш) – ад першага мужа Габрыэля (Гаўрыіла) Сітняновіча-Пятроўскага; і Ян – ад Емяльяна Шарамета.

Другі муж Т.Я. Шарамет і айчым Сімяона Полацкага – Емяльян Шарамет – быў полацкім райцай (гл. вышэй тэкст загалоўка акта ў магістрацкай кнізе). Гэтую пасаду ён займаў ужо не першы раз, уваходзячы, верагодна, у кола т.зв. «магістрацкіх асобаў». З прадстаўнікоў гэтае групы мяшчанскага асяроддзя кожны год выбіраўся «рочны» (гадавы) магістрат. Подпіс Емяльяна Шарамета прысутнічае на адной з грамат полацкага магістрата за 1650 г. [34]. Яго імя і прозвішча таксама ёсць на пачатку актавай кнігі магістрата за 1650 г., дзе ён згаданы як «раица з релии руское» у спіску асобаў, якія прымалі прысягу «водлугъ порадку права маидебурского» [35]. У тэстаменце жонкі ўказваецца, што ён выехаў «на Москву» «в чотыры недели по взятю през рат праведного осударя, ц(а)ря места Полоцког(о)» [36]. Магчыма меркаваць, што гэта адбылося недзе ў ліпені – пачатку жніўня 1654 г. Падчас складання тэстаменту, аб чым сведчыць яго змест, Емяльян Шарамет з Масквы не вярнуўся,

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

і, наогул, яго далейшы лёс на гэты час высветліць немагчыма. Некаторы час існавала версія С. Голубева, які лічыў, што ў адным з твораў Сімяона ранняга перыяду («Defloratio filii de obitu parentis») ідзе рэч аб смерці бацькі самаго Полацкага [37]. Пазнейшыя даследчыкі па зместу гэтага сачынення і даціроўцы сумесных з ім дакументаў вызначылі прыкладны час смерці бацькі Полацкага: паміж 1660 і 1663 гадамі [38]. Але ў 1987 г. М.А.Рабінсон і Л.І.Сазонава здолелі даказаць, што вышэйзгаданы твор абсалютна не мае асабістага характару, з'яўляючыся ўрыўкам, які адкалоўся ад вялікага твора Сімяона «Rhetorica practica», з раздзелу пахвальных прамоў [39]. Верагодна, якія-небудзь сляды айчыма Сімяона можна знайсці ў маскоўскіх архівах сярод спіскаў беларусаў, што трапілі ў Маскоўскую дзяржаву падчас вайны 1654 – 1667 гг. Узнікаюць сумненні наконт меркавання, што Шарамет быў вывезены гвалтам. Напрыклад, у акце ёсць дадзеныя, што дазваляюць сцвярджаць аб яго вольным кантакце з царскім ваяводай Сямёнам Лук'янавічам Стрэшневым, у якога Шарамет выкупляў палонную шляхцянку [40]. У акце таксама гаворыцца аб двух канях, што «од него зъ Смоленска прыслано», якіх Т.Я.Шарамет мусіла прадаць, каб выжыць «зъ сыном малым Яном Шереметом» [41]. Хутчэй за ўсё, Емяльян Шарамет уваходзіў у кола асобаў праваслаўнага веравызнання ў магістраце, якія забяспечылі здачу горада ў 1654 г. войску цара Аляксея Міхайлавіча.

Вызначэнне рэальнай карціны сямейнага жыцця маці Сімяона Полацкага – Т.Я.Шарамет – дазваляе ліквідаваць некаторыя супярэчнасці ў біяграфіі знакамітага асветніка. Версія І.Татарскага [42], які арыентаваўся на чалабітную Сімяона, дзе згаданы «единоутробный брат Иоанн Емельянов сын», а таксама версія Л. Н. Пушкарова [43] аб тым, што імя па бацьку Полацкага Емяльянавіч, цяпер канчаткова здаюцца памылковымі. Трэба прызнаць няверна і кампрамісную трактоўку В.К.Быліна аб верагодным манаскім званні бацькі Сімяона і, адсюль, аб двух варыянтах імя па бацьку (Емяльянавіч і Гаўрылавіч) – ад яго свецкага і царкоўнага імя [44]. Не памыліліся ў сваіх здагадках К.В.Харламповіч, які яшчэ ў пачатку XX ст. схіліўся да варыянта «Гаўрылавіч» [45], В.М.Пузікаў, які падтрымаў гэтае меркаванне [46], а таксама М.А.Рабінсон і Л.І.Сазонава (гл. спасылку 3). Напісанне ў адкрытым намі акце адной з частак прозвішча Сімяона Полацкага – Сітняновіч – пацвярджае прапанаваны двума вышэйзгаданымі аўтарамі варыянт яго напісання, у адрозненне ад панаваўшага раней Сітніановіч [47] (трэба, аднак, адмеціць, што яшчэ К. В. Харламповіч даў правільны варыянт, праўда, няверна ўказаўшы другую частку прозвішча: Піатроўскі [48]).

Асобна трэба спыніцца на існуючай у гістарыяграфіі праблеме, звязанай з братам Сімяона Ісакіем. Вядомыя дакументы, у якіх Сімяон клапоціцца перад архімандрытам Куцейнскага манастыра Філафеем Сагайдачным аб прыёме ў гэтую абіцель свайго «брата же единоутробна» Ісакія [49]; выражае ўдзячнасць таму ж Ф. Сагайдачнаму за садзейнічанне ў прыёме брата ўжо ў Іверскі манастыр, дзе Філафей з 1658 г. быў ігуменам [50]. Урэшце, існуе чалабітная Сімяона Полацкага патрыярху Іакіму з просьбай аб правядзенні следчага разбіральства па факту жорсткага забойства стральцамі вышэйзгаданага брата, якое адбылося ў 1674-м (ці ў 1675 г.) [51]. Вядома таксама, што з 1669-га па 1673 год у Іверскім манастыры знаходзіўся брат Сімяона Полацкага іераманах Ісакій [52]. У той жа час у тэксце тэстамента Т.Я.Шарамет няма імені якога-небудзь іншага сына, акрамя названых намі вышэй. У якасці меркавання мы дапускаем, што Ісакіям быў Ян (Иаан) Шарамет, які прыняў манаства па прыбыцці з Полацка ў Маскву – супадаюць першыя літары свецкага і царкоўнага імя, што было ў той час амаль

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

выключным правілам [53]. Аднак, калі дапусціць такую версію, узнікае супярэчнасць з дадзенымі І. Татарскага, згодна якому Іаан жыў у Маскве ў адным пакоі з Сімяонам (гл. спасылку 33). У той жа час, як ужо было сказана, здзіўляе адсутнасць Іаана ў спісе нашчадкаў у завяшчанні Полацкага. Ён быццам бы «выпадае» з ліку родных Сімяона падчас смерці апошняга. У гэтай сувязі магчыма, на наш погляд, меркаваць аб яго смерці да 1680 г. (год смерці Сімяона Полацкага).

Такія новыя старонкі жыцця вялікага дзеяча славянскай культуры дазволіў адкрыць знойдзены тэстамент яго маці. Некаторыя нявырашаныя пытанні патрабуюць дадатковай праверкі і далейшых даследаванняў біяграфіі Сімяона Полацкага, якога XIX ст. ацаніла як «расійскага Фенялона» [54].

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Татарский И.*** Симеон Полоцкий: (Его жизнь и деятельность): Опыт исследования из истории просвещения и внутренней церковной жизни во вторую половину XVII века. – М., 1886. – С. 25.
2. ***Голубев С.*** Отзыв о сочинении В.О.Эйгорна: Очерки из истории Малороссии в XVII в. І. Сношения малороссийского духовенства с московским правительством в царствование Алексея Михайловича. – М., 1899. – Записки Имп. Академии наук по историко-филологическому отделению. Т. VI. – № 2, 1902. – С. 111.
3. ***Робинсон М.А., Сазонова Л.И.*** Заметки к биографии и творчеству Симеона Полоцкого // Русская литература. – 1988. – № 4. – С. 136 – 137.
4. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ), ф. 1823, воп. 1, с. 1, арк. 471 – 474 адв. Трэба адзначыць, што гэты акт, як і ўсе да яго падобныя, не з'яўляецца тыповым тэстаментам, з уласцівай гэтаму тыпу пісьмовых крыніц дыпламатычнай структурай (фармулярам). Яго магчыма ідэнтыфікаваць як «запіс-тэстамент». Такія дакументы ўяўлялі сабой перапісаны ў магістрацкую кнігу тэкст завяшчання ў адпаведнасці з прынятымі ў магістрацкай справаздачы правіламі. Тэкст афіцыйна фіксаваўся і завяраўся на пасяджэнні магістрацкага суда са слоў спецыяльнай камісіі ў складзе двух лаўнікаў і «слуги врадового». Часам у склад камісіі ўваходзіў пісар. Тэкст тэстаменту ўпісваўся пасля суправаджальнай нарацыі – выкладання лаўнікамі абставін справы (паведамлення аб часе і месцы наведвання асобы, што пажадала пакінуць тэстамент). Пасля перапісанага тэксту ішло пацвярджэнне аб запісу ў актавую кнігу, потым – запісы пра выдачу выпісаў родным памершага.

   Звесткі аб адкрыцці дакумента змешчаны ў інфармацыйна-аналітычным і культуралагічным бюлетэні Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў і Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі «Кантакты і дыялогі». – ***Гардзееў М.*** Новыя звесткі да біяграфіі Сімяона Полацкага. – Кантакты і дыялогі. – № 7-8 (31 – 32). – 1998. – С. 54 – 56. Зараз акт знаходзіцца ў стане падрыхтоўкі да друку ў рэдакцыі часопіса «Славяноведение» у Маскве, яго выданне плануецца ў № 2 вышэйзгаданага часопіса за 1999 г.

   ***Заўвага:*** вытрымкі з акта ў дадзенай публікацыі падаюцца ў адпаведнасці з палеаграфічнымі патрабаваннямі. Курсівам выдзеленыя вынасныя надрадковыя літары; у круглых дужках знаходзяцца скарочаныя часткі слоў пад тытламі.
5. ***Голубев С.*** Указ. соч. – С. 113.
6. НГАБ, ф. 1823, воп. 1, с. 1, арк. 474. – Мы выкарыстоўваем форму *Сітняновіч-Пятроўскі* тут і далей, таму што ў нашым акце пры вызначэнні ўсіх членаў сям'і, што мелі гэтае прозвішча, выкарыстоўваецца пэўна такая форма. Акрамя таго, калі адсачыць ужыванне розных формаў (*Пятроўскі-Сітняновіч*, *Сітняновіч-Пятроўскі* і абедзве часткі прозвішча паасобку) ва ўсіх вядомых актах, магчыма меркаваць, што абедзве часткі падвоенага прозвішча былі раўназначнымі і атрымліваліся ў спадчыну разам – ад першага мужа Т. Я. Шарамет Габрыэля Сітняновіча-Пятроўскага (Габрыэль названы менавіта ***першым***, г. зн. ***адзіным*** першым, ад якога і пайшло падвоенае прозвішча. – ***Напрыклад:***


Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

НГАБ, ф. 1823, воп. 1, с. 1, арк. 471 адв.) Пытанне наконт таго, чаму сам Сімяон і іншыя часта ўжывалі адну з частак, застаецца адкрытым.
7. *Татарский И.* Указ. соч. – С. 64 – 65, 204. На жаль, аўтар не абгрунтоўвае сваю версію архіўнымі дадзенымі.
8. НГАБ, ф. 1823, воп. 1, с. 1, арк. 471.
9. *Напрыклад:* актыкаваный тэстамент зяменіна Полацкага ваеводства А.Г.Чаркаса. – НГАБ, ф. 1823, воп. 1, с. 1, арк. 481.
10. ***Сагановіч Г.*** Невядомая вайна: 1654 – 1667. – Мн.: Навука і тэхніка, 1995. – С. 71.
11. НГАБ, ф. 1823, воп. 1, с. 1, арк. 471 адв., 473.
12. НГАБ, ф. 1823, воп. 1, с. 1, арк. 471 адв.
13. НГАБ, ф. 1823, воп. 1, с. 1, арк. 474 адв.
14. НГАБ, ф. 1823, воп. 1, с. 1, арк. 472 адв.
15. ***Робинсон М.А., Сазонова Л.И.*** Указ. соч. – С. 137.
16. ***Татарский И.*** Указ. соч. – С. 204.
17. Тамсама. – С. 208.
18. Тамсама. – С. 325.
19. ***Голубев С.*** Указ. соч. – С. 119. – У знойдзеным намі акце згадваецца жонка В.У.Стефановіча, на жаль, без яе імя: «Теж одписала п(а)ни Базылевои Стефановичовои, стрыечнои сестре сынов своих першог(о) малжонка, катанку саевую чорную». – НГАБ, ф. 1823, воп. 1, с. 1, арк. 473 адв. Яна магла быць адзінай сястрой Сімяона, аб чым ён гаворыць у posрscriptum вышэйзгаданага ліста (гл.: ***Голубев С.*** Указ. соч. – С. 119), калі да гэтага часу памёрлі дзве дачкі брата Т.Я. Шарамет – Лукаша Якаўлевіча, згаданыя ў тэстаменце. – НГАБ, ф. 1823, воп. 1, с. 1, арк. 473 адв.
20. ***Голубев С.*** Указ. соч. – С. 118.
21. НГАБ, ф. 1823, воп. 1, с. 1, арк. 473.
22. НГАБ, ф. 1823, воп. 1, с. 1, арк. 472 адв., 473.
23. ***Робинсон М.А., Сазонова Л.И.*** Указ. соч. – С. 138.
24. НГАБ, ф. 1823, воп. 1, с. 1, арк. 187. – Тут трэба згадаць аб цікавым меркаванні М.А. Рабінсона і Л.І. Сазонавай: апіраючыся на факт наяўнасці ў бібліятэцы Сімяона Полацкага – Сільвестра Мядзведзева кнігі «Grammaticarum institutionum libri IV pro usu scholarum Novodvorscianarum in Alma Academia Cracoviensi. Opera et Studio M. Lucae Piotrowski in eadem Academia Novodvorsciani Gramm. Profess: Cracoviae, 1676», яны дапусцілі, што аўтар гэтага падручніка – магістр мастацтваў, доктар філасофіі і прафесар граматыкі Новадворскага калегіума пры Ягелонскім універсітэце Лука Пятроўскі — мог быць братам Сімяона, таму што пэўны разлад паміж братамі на рэлігійнай глебе меў месца (гл. вышэй ліст Сімяона Луке). – ***Робинсон М.А., Сазонова Л.И.*** Указ. соч. – С. 138. Аднак гэтае меркаванне, пры ўсёй сваёй рэальнасці, патрабуе дадатковай праверкі. Ва ўсялякім выпадку, незразумелыя матывы, кіруючыся якімі чалавек, што дабіўся такіх высокіх навуковых ступеняў, вярнуўся з еўрапейскай сталіцы ў Полацк, каб быць пісарам ў магістраце.
25. ***Татарский И.*** Указ. соч. – С. 325.
26. ***Голубев С.*** Указ. соч. – С. 114.
27. ***Робинсон М.А., Сазонова Л.И.*** Указ. соч. – С. 137.
28. ***Hippisley A.*** The Poetic Style Of Simeon Polotsky. Birmingham, 1985, p. 11 (Birmingham Slavonic Monographs. – № 16).
29. НГАБ, ф. 1823, воп. 1, с. 1, арк. 474.
30. ***Робинсон М.А., Сазонова Л.И.*** Указ. соч. – С. 138.
31. ***Голубев С.*** Указ. соч. – С. 119.
32. НГАБ, ф. 1823, воп. 1, с. 1, арк. 472, 472 адв., 473, 474.
33. ***Татарский И.*** Указ. соч. – С. 208.
34. НГАБ, ф. 1823, воп. 1, с. 49, арк. 2. – Грамата аб вызваленні купца Г.Міцьковіча ад гарадскіх павіннасцей ад 9 снежаня 1650 г.
35. НГАБ, ф. 1823, воп. 2, с. 1, арк. 34.
36. НГАБ, ф. 1823, воп. 1, с. 1, арк. 471 адв.
37. ***Голубев С.*** Указ. соч. – С. 112.
38. ***Пушкарев Л.Н.*** Симеон Полоцкий // ***Жуков Д.А., Пушкарев Л.Н.*** Русские писатели XVII века. – М., 1972. – С. 203.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

39. ***Робинсон М. А., Сазонова Л. И.*** Указ. соч. – С. 138.
40. «А копеняк фалендышовыи, которыи еще перед ратю малжонку ее (Т.Я.Шарамет, – *М. Г.*) был зоставлен у копах дванадцати од п(а)на Артема Микулича, тотъ... не пропал, але деи оного самъ пан Шеремет, малжонок ее, даровал боярыну Семену Лукяновичу Стрешневу, выкупуючы с полону п(а)ни Александровую Пчыцкую... . Да тому ж, в тои же справе годечы, дал ложъки серебраные две». – НГАБ, ф. 1823, воп. 1, с. 1, арк. 471 адв.
41. НГАБ, ф. 1823, воп. 1, с. 1, арк. 474.
42. ***Татарский И.*** Указ. соч. – С. 30.
43. ***Пушкарев Л.Н.*** Указ. соч. – С. 201.
44. ***Былинин В.К.*** О дате рождения Симеона Полоцкого // Труды отдела древнерусской литературы. – 1985. – Т. 39. – С. 370.
45. ***Харлампович К.В.*** Малороссийское влияние на великорусскую церковную жизнь. – Казань, 1914. – Т. 1. – С. 379.
46. ***Пузікаў В.М.*** Новыя матэрыялы аб дзейнасці Сімяона Полацкага // Весці АН БССР: Серыя грамад. н., 1957. – № 4. – С. 71 – 78.
47. ***Робинсон М.А., Сазонова Л.И.*** Указ. соч. – С. 134.
48. ***Харлампович К.В.*** Указ. соч. – С. 379.
49. ***Робинсон М.А., Сазонова Л.И.*** Указ. соч. – С. 137.
50. Тамсама. – С. 136.
51. Тамсама. – С. 140. Дакумент апублікаваны: ***Робинсон М.А., Сазонова Л.И.*** Указ. соч. – С. 140.
52. Тамсама. – С. 137.
53. Гл. напрыклад: Мялецій (Максім) Сматрыцкі, Лазар (Лука) Барановіч, Стэфан (Сімяон) Яворскі, Сільвестр (Сямён) Мядзведзеў, Феафан (мірское імя – Еліязар, першае манаскае – Елісей) Пракаповіч і г. д.
54. ***Мальгин Т.*** Речь о состоянии в России древнего и новейшего народного просвещения, читанная в торжественное годовое собрание Имп. Российской Академии, бывшее 8 числа декабря 1808 г. – Сочинения и переводы, издаваемые Российскою Академиею. Ч. IV (1810). – СПб., 1810. – С. 273.